[7] Гл.: Звязда. 1946. 30 сакавіка.
[8] КПСС в резолюциях... Т. 8. С. 24.
[9] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 47, спр. 73, л. 24; спр. 214, л. 368.
[10] Гл.: Патоличев Н. С. Отчетный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии на XX съезде КП(б)Б. Минск, 1952. С. 47, 49—50.

С. А. ЮРЫС

## АДНАЎЛЕННЕ КААПЕРАТЫЎНАГА ГАНДЛЮ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945—1947)

Вайна і часовая акупацыя тэрыторыі Беларускай ССР нанеслі гаспадарцы спажывецкай кааперацыі вялізны ўрон. Ён склаў 807 млн рублёў. Было знішчана і пашкоджана 6448 кааператыўных пабудоў, сярод якіх: 2548 магазінаў, 1827 складоў і 179 жылых будынкаў [1]. Ужо ў красавіку 1942 года ў Маскве пры Цэнтрасаюзе пачала працаваць аператыўная група Белкаапсаюза, якая займалася ў асноўным кадравымі пытаннямі. Былі ўзяты на ўлік работнікі сістэмы Белкаапсаюза, эвакуіраваныя ва ўсходнія раёны краіны, прыняты меры па падрыхтоўцы новых кадраў. Так, у 1942—1943 гадах 63 бухгалтары прайшлі навучанне на чатырохмесячных курсах пры Новасібірскім і Чкалаўскім аблспажыўсаюзах, а з дапамогай Тамбоўскага аблспажыўсаюза было падрыхтавана 16 кіраўнікоў гандлю райспажыўсаюзаў [2].

Па меры таго, як вызвалялася ад варожых войск тэрыторыя рэспублікі, пачыналася аднаўленне кааператыўнай гаспадаркі. Ужо ў першым квартале 1944 года была адноўлена сетка спажывецкай кааперацыі ў 48 раёнах Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцей [3].

На пасяджэнні прэзідыума праўлення Белкаапсаюза 31 жніўня 1945 года, а потым на нарадзе старшынь аблспажыўсаюзаў (20 лістапада) былі падведзены вынікі дзейнасці па аднаўленню спажыўкааперацыі і вызначаны яе канкрэтныя задачы ва ўмовах мірнага жыцця. Задавальняць попыт сельскага насельніцтва работнікі спажывецкай кааперацыі былі павінны шляхам усялякага пашырэння тавараабароту за кошт мясцовых вырабаў. У кароткія тэрміны трэба было перайсці на даваенныя ўмовы забеспячэння пастаўшчыкоў таварамі, разгарнуць сетку раймагаў, культмагаў, сельмагаў і падрыхтавацца да значнага пашырэння ў 1946 годзе колькасці спецыялізаваных і агульных магазінаў, разгарнуць гандаль таварамі гаспадарчага прызначэння, паляпшаць бытавое абслугоўванне, павялічваць нарыхтоўкі сыравіны [4]. Абласныя камітэты партыі патрабавалі ад РК КП(б)Б прыняць канкрэтныя меры па ўзмацненню кіраўніцтва гандлёвымі арганізацыямі, накіроўваючы іх на хутчэйшае адраджэнне гандлевай сеткі, на бесперабойнае забеспячэнне насельніцтва таварамі першай неабходнасці.

У чацвёртай пяцігодцы аб'ём рознічнага тавараабароту дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю Беларусі павінен быў павялічыцца на 28 % у параўнанні з 1940 годам. Для ажыццяўлення пераходу ад нарміраванага забеспячэння насельніцтва па картачкам да разгорнутага гандлю прадугледжвалася пашырыць гандлёвую сетку, забяспечыць гандлёвыя арганізацыі кваліфікаванымі кадрамі, транспартам, абсталяваннем, інвентаром [5]. У сістэме спажывецкай кааперацыі была распрацавана праграма развіцця сеткі прадпрыемстваў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, баз і складоў.

Ужо першы год рэалізацыі заданняў плана аднаўлення і развіцця кааператыўнага гандлю БССР паказаў павелічэнне яе ролі ў барацьбе за павышэнне матэрыяльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню савецкага народа. Аднак перабудова сельскага гандлю ў дачыненні да запатрабаванняў мірнага часу ажыццяўлялася марудна, у гандлёвай дзейнасці спажывецкай кааперацыі выяўляліся істотныя недахопы. Кепска ўключаліся ў тавараабарот вырабы мясцовай вытворчасці. Так, удзельная вага дэцэнтралізаваных закупак у рознічным тавараабароце Беларусі 1946 года складала толькі 9,6 %[6].

Новы этап развіцця савецкага кааператыўнага гандлю адкрыла пастанова Савета Міністраў СССР ад 9 лістапада 1946 года «Аб разгортванні кааператыўнага гандлю ў гарадах і пасёлках харчовымі і прамысловымі таварамі і аб павелічэнні вытворчасці харчавання і тавараў шырокага ўжытку кааператыўнымі прадпрыемствамі». Дзейнасць спажывецкай каа-

перацыі па пашырэнню вытворчасці прадметаў ужытку і гандлю імі, а таксама прадуктамі харчавання была прызнана нездавальняючай. Па-сутнасці, спажыўкааперацыя абмежавала сваю ролю размеркаваннем дэфіцытных тавараў. Лішкі сельскагаспадарчай сыравіны, якія меліся ў вёсцы, не закупляліся для забеспячэння гарадскога насельніцтва, кааператары не разгортвалі ў неабходных памерах вытворчасць тавараў шырокага ўжытку і прадуктаў харчавання [7]. Асноўная задача спажывецкай кааперацыі заключалася ва ўсямерным развіцці тавараабароту паміж горадам і вёскай. Выразна акрэсліваліся асноўныя рысы новага этапу савецкага гандлю: падрыхтоўка да адмены гандлю па картачкам і пераход да бескартачнага гандлю; здаровая канкурэнцыя паміж дзяржаўным і кааператыўным гандлем за лепшае абслугоўванне гарадскога і сельскага спажыўца; значнае пашырэнне сферы прымянення рыначных цэн, паслядоўнае паніжэнне камерцыйных цэн і пераход да дзяржаўнага гандлю па адзіных цэнах.

Канкрэтны план мерапрыемстваў па разгортванню гандлю прамысловымі і харчовымі таварамі ў гарадах і рабочых пасёлках рэспублікі, павелічэнню іх вытворчасці быў намечаны пастановай Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 14 снежня 1946 года. Спажывецкай кааперацыі было дазволена ў гарадах і рабочых пасёлках, на чыгуначных станцыях і прыстанях арганізаваць гандаль сельскагаспадарчымі прадуктамі па рыначных цэнах, але не вышэй цэн, устаноўленых для дзяржаўнага камерцыйнага гандлю. Толькі ў першым паўгоддзі 1947 года трэба было адкрыць 528 рознічных гандлёвых прадпрыемстваў, за год — рэалізаваць 1 тыс. 800 т мяса, 40 тыс. т бульбы, а таксама другія прадукты, выпусціць тавараў народнага ўжытку на 35 млн рублёў. Партыйныя і савецкія арганізацыі абавязваліся вылучыць спажыўкааперацыі для арганізацыі гандлю ў гарадах 110 рознічных гандлёвых прадпрыемстваў [8].

На бюро абласных камітэтаў КП(б)Б у снежні 1946 года былі разгледжаны пытанні выканання гэтай пастановы. Напрыклад, бюро Гомельскага АК КП(б)Б указала на слабы кантроль мясцовых партыйных органаў за развіццём кааператыўнага гандлю. Раённыя камітэты КП(б)Б, пярвічныя партыйныя арганізацыі райспажыўсаюзаў, асабліва ў глыбінных раёнах, павінны былі разгарнуць работу па нарыхтоўках сельскагаспадарчых прадуктаў і адходаў прамысловай сыравіны. Пярвічным партыйным арганізацыям спажывецкай кааперацыі прапаноўвалася карэнным чынам перабудаваць партыйна-палітычную работу, накіраваць яе на выкананне плана па разгортванню кааператыўнага гандлю, павелічэнню выпуску тавараў шырокага ўжытку, паляпшэнню якасці і зніжэнню сабекошту выпускаемай прадукцыі [9].

У канцы 1946 года на абласных нарадах работнікаў спажыўкааперацыі разгледжваўся ход выканання указаных пастаноў. Па выніках абласной нарады Гомельскі АК КП(б)Б разаслаў пісьмо сакратарам РК КП(б)Б. У пісьме адзначалася, што раённыя камітэты партыі не ўнікаюць у пытанні нарыхтовак, таму не могуць уздзейнічаць на далейшае зніжэнне цэн на сельскагаспадарчыя прадукты. Кіраўнікі кааператыўных арганізацый, звяртаючыся за дапамогай у партыйныя і савецкія органы па пытаннях разгортвання гандлю, сустракаюць фармальныя адносіны да іх прапаноў і просьбаў. АК КП(б)Б кваліфікаваў такія адносіны да кааператыўнага гандлю як падрыў важнейшай дзяржаўнай справы і патрабаваў безумоўнага выканання прынятых рашэнняў [10].

Дзякуючы вялікай рабоце, якую праводзілі партыйныя органы і работнікі спажывецкай кааперацыі, у 1946 годзе быў выкананы план аднаўлення рознічнай гандлёвай сеткі. У гандлёвую сетку спажыўкааперацыі ўваходзіла 7213 прадпрыемстваў (на 1 студзеня 1948 года) супраць 3105 (на 1 студзеня 1945 года). Гэта склала 59,1 % даваеннага ўзроўню, а сетка прадпрыемстваў грамадскага харчавання на 1 студзеня 1948 года ўключала 436 прадпрыемстваў, што адпавядала 105,3 % даваеннага ўзроўню [11]. Аднак у некаторых абласцях БССР аднаўленне гандлёвай сеткі праходзіла павольна. Так, у Віцебскай вобласці на 1 студзеня 1947 года колькасць гандлёвых прадпрыемстваў склала 37 % даваеннага ўзроўню, а ў раёнах асабліва пацярпеўшых у час Вялікай Айчыннай вайны становішча было яшчэ больш цяжкім. У Суражскім раёне да вайны было 95 гандлёвых прадпрыемстваў, а на 1 чэрвеня 1947 года толькі 15, у Лёзненскім — 30 супраць 99 да вайны [12]. Неабходна дадаць, што значная колькасць магазінаў і лавак знаходзілася ў арэндаваных памяшканнях, гэта значыць у сялянскіх дамах. У Маладзечанскай вобласці, напрыклад, такіх гандлёвых кропак у 1947 годзе было 395 з 424 [13].

За два пасляваенныя гады адбыліся некаторыя змяненні ўдзельнай вагі асобных тавараў у агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту. Удзельная вага гарэлкі і вінна-гарэлачных вырабаў у 1947 годзе паменшылася да 39,5 % супраць 63,0 у 1945 годзе (да вайны — 15,2 %). Павялічыўся продаж хлебабулачных вырабаў, цукру, малака, яек і іншых прадуктаў. Да канца 1947 года ўдзельная вага прамысловых тавараў у абароце вырасла да 38,3 %[14]. Разам з тым паўсюдна наглядаліся перабоі ў забеспячэнні таварамі першай неабходнасці — соллю, запалкамі, газай. Асноўнымі прычынамі гэтага становішча з'яўляліся як нястача рыначных фондаў, так і транспарту для дастаўкі тавараў.

Прынятыя партыяй і ўрадам энергічныя меры па пашырэнню сферы дзейнасці спажывецкай кааперацыі дазволілі ўстойліва павялічваць аб'ём тавараабароту і выконваць планавыя заданні. Так, у 1945 годзе аб'ём кааператыўнага гандлю склаў 1027,3 млн рублёў, а ў 1947 годзе — 2785,8 млн рублёў. Выкананне гадавых заданняў адпаведна склала 139,7 %, 109,7 %[15]. Нягледзячы на значныя намаганні па аднаўленню і развіццю рознічнай гандлёвай сеткі, яе агульны ўзровень да канца даследуемага перыяду не дасягнуў даваеннага, а колькасны рост матэрыяльнай базы і яе якасны стан адставалі ад росту аб'ёму рознічнага тавараабароту.

[1] Гл.: 40 лет Советской потребительской кооперации. 1917—1957 г. М., 1957. С. 90; ЦДАКР БССР. Ф. 332, воп. 5, спр. 255а, Л. 2.
[2] Гл.: ЦДАКР БССР. Ф. 332, воп. 5, спр. 2, л. 69.
[3] Там жа. Спр. 158, л. 1.
[4] Там жа. Спр. 12, л. 191—192.
[5] Гл.: Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР (на 1946—1950 гг.). Мінск, 1946. С. 27.
[6] ЦДАКР БССР. Ф. 7, воп. 3, спр. 1226, л. 11.
[7] Гл.: Сборник правительственных постановлений и ведомственных указаний о кооперативной торговле в городах и поселках. Вып. 1. М., 1947. С. 3 і далей.
[8] Гл.: О мероприятиях по развертыванию кооперативной торговли в городах и поселках БССР продовольственными и промышленными товарами и увеличению производства продовольствия и товаров широкого потребления копеadmin кооперативными предприятиями и местной промышленностью БССР. Постановление Совета Министров и Центрального Комитета КП(б)Б. Минск, 1946. С. 13 і далей.
[9] ПА Гомельскага АК КПБ. Ф. 144, воп. 13, спр. 10, л. 240.
[10] Там жа. Воп. 1, спр. 80, л. 39—40.
[11] ЦДАКР БССР. Ф. 332, воп. 5, спр. 255а, л. 8, 12.
[12] Там жа. Спр. 26, л. 219.
[13] Там жа. Спр. 168, л. 151, 166.
[14] Там жа. Спр. 255а, л. 19.
[15] Там жа. Л. 5.

С. Б. ЖАРКО

# ФАРМІРАВАННЕ ПАТРЫЯТЫЗМУ І ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ Ў МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ ПРАЦОЎНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР У IX ПЯЦІГОДЦЫ

Заснавальнікі навуковага камунізму К. Маркс і Ф. Энгельс у рабоце «Нямецкая ідэалогія» указвалі, што «гісторыя ёсць не што іншае, як паслядоўная змена асобных пакаленняў, кожнае з якіх выкарыстоўвае матэрыялы, капіталы, прадукцыйныя сілы, перададзеныя яму ўсімі папярэднімі пакаленнямі...»[1]. Перадача станоўчага вопыту, набытага як усім чалавецтвам, так і непасрэдна папярэднім пакаленнем, складае важны напрамак ідэйна-выхаваўчай работы.

Пераемнасць, захаванне і прымнажэнне рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый камуністычнай партыі і савецкага народа становіцца ўсё больш узрастаючай па сваім значэнні праблемай выхаваўчага працэсу.

У. І. Ленін заклікаў беражліва захоўваць і развіваць «...прывычкі, навыкі, перакананні, якія рабочы клас выпрацоўваў сабе на працягу многіх дзесяцігоддзяў у барацьбе за палітычную свабоду, каб уся сума гэтых прывычак, навыкаў і ідэй паслужыла сродкам выхавання ўсіх працоўных...»[2]

У перыяд, калі краіна праводзіць рэвалюцыйныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, асаблівае месца належыць працоўным вытворчым ка-